# ПЕРЫФРАЗА Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА

**Каско М.С.**

**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

Уладзімір Калеснік адзначаў: "Яму арганічна ўласціва адчуванне магчымасцей слова як творчага матэрыялу, у рабоце са словам паэт ніколі не абмяжоўваў сябе ні слыхавымі, ні зрокавымі вобразамі, а імкнуўся аперыраваць даступнымі слову спалучэннямі і сутыкненнямі гукаў і колераў, пластычных аб'ёмаў, рытмаў і рухаў". Хто ж ён, гэты самы майстар пяра, які прафесійна аперыруе мастацкімі тропамі, а асабліва перыфразамі? Адказ відавочны: Калеснік усхваляў менавіта Максіма Танка. Напоўненыя глыбокім філасофска-аналітычным асэнсаваннем жыцця і чалавека, высокім гуманістычным зместам і грамадзянска-патрыятычным пафасам, яго творы раскрылі асаблівасці нацыянальнага характару, гістарычнага шляху беларускага народа, выявілі багацце гісторыі і культуры, вялікія магчымасці мовы. У кожнай перыфразе паэта ёсць невялікая загадка. Раскрыць яе дапамагае семантычная арганізацыя самога тропа і кантэкст. Перыфраза выклікае аўдыторыю чытачоў Максіма Танка да разважання, прымушае заўважыць выразнасць літаратурнай мовы, развіваць сваю культуру маўлення.

Перад тым, як перайсці да індывідуальна – танкаўскіх перыфраз, трэба звярнуцца да навуковага азначэння мастацкага тропа. Перыфраза (ад грэч. Paraphrasis - апісальны выраз) - гэта выражаны словазлучэннем кантэкстуальны сінонім, які ў пэўным кантэксце замяняе агульнапрынятую назву асобы, прадмета, з'явы. Гэта часцей за ўсё індывідуальна-аўтарскія ўтварэнні, таму для іх устойлівасць і ўзнаўляльнасць не характэрныя. Перыфраза ўяўляе сабой разгорнутую метанімію — словазлучэнне, якое замяняе назву прадмета ці з'явы на рэальнай сувязі, г. зн. апісаннем іх істотнай прыметы.

У слоўным акружэнні змест перыфразы звычайна лёгка раскрываецца. Яе можна пачуць у размове, калі хто-небудзь замест “радзіма” скажа *“зямля бацькоў”.* Гэта традыцыйныя перыфразы, якія зразумелыя нам і без кантэксту. Напрыклад, *беларускі шоўк* – лён, *вестуны вясны* – птушкі.

Аднак звернемся да аўтарскіх утварэнняў Максіма Танка. Іх можна падзяліць на 5 груп паводле структурна – семантычнай будовы, якія мы зараз разгледзім па чарзе, дапоўніўшы прыкладамі:

Назоўнікавыя перыфразы

Перыфразы з прадметным значэннем скарыстоўваюцца паэтам у якасці назоўнікаў: *краіна бацькоў* – Беларусь, *абразы цудатворцаў* – іконы, *муры бажніцаў* – святыя храмы, *камяні Брэста* – Брэсцкая крэпасць.

У сказе яны выконваюць ролю дапаўнення, від сувязі - кіраванне. Сустракаюцца ў Максіма Танка назоўнікавыя перыфразы, якія складаюцца з аднаго толькі назоўніка: *сівер* – паўночны вецер, *грыбасей* – грыбны дождж, *лірнік* – паэт.

Найбольш ужываюцца назоўнікавыя перыфразы, якія складаюцца са словазлучэння “прыметнік+назоўнік”, від сувязі – дапасаванне: *снежная воўна* – мяцеліца, *сінія хусткі* – воблакі, *легендарнае возера* – Свіцязь.

Можна сустрэць таксама назоўнікавыя перыфразы тыпу “назоўнік+прыметнік”, у якіх адваротны парадак слоў (інверсія): *сцены векавыя* – стары дом, *мурашы гарадскія* – трамваі, тралейбусы, таксі; *далонь кляновая* – кляновы ліст.

Дзеяслоўныя перыфразы

У вершах Максіма Танка можна адзначыць і дзеяслоўныя перыфразы, якія абазначаюць дзеянне, працэс, стан. Сярод іх перыфразы наступных граматычных мадэлей: “дзеяслоў+назоўнік у творным склоне”, “дзеяслоў+назоўнік у вінавальным склоне без прыназоўніка”, “дзеяслоў+прыслоўе”. Від сінтаксічнай сувязі – кіраванне і прымыканне. Прыкладамі такіх перыфраз з’яўляюцца наступныя выразы: *бадзяцца*

*батраком* – быць на службе ў пана, *малаціць нагамі* – танцаваць, *грызці навуку* – старанна вучыцца.

Дзеяслоўныя перыфразы менш ужываюцца ў вершах Максіма Танка, часцей дзеяслоў ўваходзіць у склад перафрастычных сказаў.

Перыфразы - сінонімы

Непераўзыдзенныя мастацкія здольнасці і багатая фантазія Максіма Танка дапамаглі яму стварыць цэлыя сінанімічныя рады для некаторых паняццяў: *Радзіма – краіна бацькоў, краіна азёрная, казачная старонка, сонечны край, спадчына бацькоў, зачараваны край, партызанка мая; сам паэт – пясняр сялянскі, баян-чарадзей, пясняр-валацуга, лірнік, сын нядолі.*

Перыфразы – сказы

Перыфразы са структурай сказа можна вылучыць са шматлікіх вершаў Максіма Танка. Перыфразы-сказы ўжываюцца з рознай сінтаксічнай будовай:1)*у хлявы загналі дзень* – прыгналі каровы на ноч з пашы (аднасастаўны, няпэўна-асабовы сказ); 2)*дзяды прыходзілі вячэраць*– продкі напамінаюць пра сябе (двухсастаўны, развіты сказ).

Усе гэтыя сказы простыя па будове. Семантыка такой перыфразы абумоўлена значэннямі ўсіх слоў, якія ўваходзяць у яе састаў. З аб’яднання, зліцця значэнняў гэтых слоў вынікае агульная семантыка перыфразы.

Разгорнутыя перыфразы

Адзначаючы структурна-семантычную разнастайнасць перыфраз у Максіма Танка, можна заўважыць, што некаторыя вершы паэта – гэта вялікія разгорнутыя перыфразы. Разгледзім адзін з іх:

*Закалыхваючы,*

*Пэўна, стомленая,*

*Памылілася маці:*

*Не на верацяно,*

*А на сэрца маё*

*Сваю песню*

*Навіла.*

*Я і сёння асцярожна,*

*З хваляваннем*

*Разматваю*

*Клубок песень,*

*Каб хаця не парваць*

*Яе нітку.*

Гэта не проста верш, а цэлае вершаванае апавяданне, дзе змяшчаецца расказ пра маці, яе цяжкую працу, песні – калыханкі, якія жанчына спявала ў дзяцінстве сыну і якія паэт помніў усё жыццё.

Максім Танк – паэт магутнага паэтычнага таленту. Яго паэзія – гэта “кроў, што пульсуе па жылах, сонца, якое прасторы святлом азарыла, і без чаго, як без маці або без Радзімы, ні нараджацца, ні жыць на зямлі немагчыма”. Вобразны сродак мовы, перыфраза, надае вершам Танка высокую эмацыянальнасць, узнёсласць. А дзякуючы варыятыўнасці форм гэтага мастацкага тропа, ён дапамагае ажывіць творы паэта, зрабіць стыль Максіма Танка непадобным да творчасці іншых пісьменнікаў. Паэзія, якая захапляе – вось як можна ахарактарызаваць вершы класіка.

**Літаратура**

1. Калеснік,У. Максім Танк: Нарыс жыцця і творчасці / У.Калеснік. – Мн.:Маст.літ.,1981. – 189с.
2. Лепешаў, І.Я. Лінгвістычны аналіз тэксту.ebooks.grsu.by
3. Малажай, Г. М. Сучасная беларуская мова. Слова. Перыфраза. Фразеалагізм/Г. М. Малажай – Мн.: Выш.шк., 1992. – 238с.
4. Мікуліч, М. У. Максім Танк.Талент, заручаны з небам / М. У. Мікуліч. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2012. – 336с.
5. Новая зямля. Песні. knihi.com
6. Паэтычная старонка Максіма Танка http://maksimtank.ru/